«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

“Міліцыя не павінна так біць дубінкай людзей”. Прысуд у Асіповічах за знявагу падпалкоўніка міліцыі

17.06.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, сілавыя структуры




Суд Асіповічскага раёна

У судзе Асіповіцкага раёна 16 чэрвеня вынесены прысуд па крымінальнай справе за абразу супрацоўніка міліцыі (арт. 369 КК РБ). На лаве падсудных – жыхар аграгарадка Лапіч Генадзь Казючыц.

Справу разглядала суддзя **Таццяна Сакратарова**, дзяржабвінаваўца - **Святлана Андрыеўская.**

Пацярпелы супрацоўнік міліцыі **Цімур Пахоменка** сам звярнуўся ў суд Асіповічскага раёна з наступнай іскавай заявай:

> *“9 лістапада, знаходзячыся ў неўстаноўленым месцы, з дапамогай інтэрнэт-мэсэнджара Тэлеграм у сувязі з выкананнем мною службовых абавязкаў, Генадзь Казючыц размясціў у агульным доступе для іншых карыстальнікаў інфармацыю, якая не адпавядае рэчаіснасці і ганіць мае гонар і годнасць. Супрацьпраўнымі дзеяннямі мне былі нанесеныя пакуты і маральная шкода, якія выявіліся ў агульнадаступнасці фраз і выразаў, якія сталі вядомыя маім сябрам і знаёмым, сваякам. У сувязі з чым я адчуваю пачуццё сораму, парушэнне сну, што безумоўна адбівалася на маёй службовай дзейнасці, сістэматычнае знаходжанне ў прыгнечаным стане з-за ўбачанага і прачытанага. Названыя абставіны глыбока перажывалі мае блізкія і сваякі. Кампенсацыю маральнай шкоды я ацэньваю ў суму 5.000 рублёў.”*



Абвінавачаны Казючыц віну прызнаў, пазоў прызнае часткова. На суму каля тысячы рублёў, паколькі не мае працы.

Згодна з абвінавачаннем, Казючыц Генадзь, маючы намер на публічную абразу прадстаўніка ўлады - начальніка аддзела аховы правапарадку міліцыі грамадскай бяспекі аддзела ўнутраных спраў Ленінскага раёна Магілёва падпалкоўніка міліцыі Пахоменка, з мэтай падрыву аўтарытэту дзяржаўнай улады ў прыніжэнні гонару і годнасці, у сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў публічна абразіў яго пры наступных абставінах. Так, 9 лістапада 2020, знаходзячыся па месцы свайго жыхарства, з дапамогай мабільнага тэлефона ў раней апублікаваным у групе "Народны прысуд" сацыяльнай сеткі Фэйсбук надпісу, зрабіў каментар з абразамі, якія змяшчаюць негатыўную ацэнку ў адрас Пахоменка.

Тым самым публічна ў непрыстойнай форме абразіў, прынізіўшы гонар і годнасць у сувязі з выкананнем ім сваіх службовых абавязкаў.

Генадзь Казючыц працаваў трэнерам-выкладчыкам ДЮСШ ў Асіповічах, але пасля затрымання і паказу яго па тэлевізары, быў звольнены з працы. Мае дзяцей.

Тлумачыць, што ў сацыяльнай сетцы ўбачыў відэа, на якім супрацоўнікі міліцыі праходзіць каля затрыманых людзей, якія стаялі каля сценкі і збівае іх дубінкай.

> - *Міліцыя не павінна так біць проста дубінкай",* - кажа Казючыц.
>
> - *Вам асабіста вядомыя такія факты?* – пытаецца суддзя.
>
> - Там было ўсё відаць.
>
> - Што там было відаць?
>
> - Там чалавека збівалі. Нельга так.

Пацярпелы Пахоменка ў судзе блытаецца з месцам і часам размяшчэння каментару і кажа, што было шмат абразаў і негатыўных каментароў.

Дарэчы, Пахоменка з'яўляецца пацярпелым па парадку 10 крымінальных спраў.

Дзякуючы гэтым каментарам ён стаў практычна медыйнай асобай. Непрыемна яму чытаць і чуць ад родных і знаёмых словы аб тым, кім цябе лічаць.

З большасцю сяброў і знаёмых спыніў зносіны ў сувязі з гэтым.

Некаторыя каментары былі пра фізічнай пагрозе і ліквідацыі. Быў вымушаны адправіць дзіця ў іншае дзяржава на вучобу.

Кожны дзень пазнаюць у горадзе.

Пастанова суда: **два гады абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу ("хімія").**

Таксама прызнаць кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1 000 рублёў і 87 рублёў судовых выдаткаў. Тэлефоны пакінуць пад арыштам да пагашэння прызначаных сум.

𝕏 Опубликовать



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

У Мінску асудзілі Алену Церашкову, двухразовую чэмпіёнку Беларусі па тэквандо, пісьменніцу і хірургіню


За ўдзел у акцыі пратэсту ў Мінску асудзілі палітзняволеную Галіну Лагацкую (дапоўнена)

У Жлобіне за тыдзень – тры суды за ўдзел у акцыях пратэсту ў 2020 годзе

"З мэтай вядзення дэструктыўнай дзейнасці". За ўдзел у акцыях пратэсту асудзілі двух братоў і жонку аднаго з іх

www.

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 23 траўня па 14 чэрвеня

Гісторыя аднаго зварота. Як дзве жанчыны абаранілі свае правы

"Як захаваць сябе ў час працяглага зняволення?" Адкрыты запіс падкаста "Вясна прыйдзе" ў Дзень палітвязняў Беларусі

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)




ГАЛОЎНАЕ

Патрабуем адмяніць прысуд у дачыненні да Леаніда Судаленкі, спыніць дзяржаўнае самавольства і пераслед праваабаронцаў



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Пяць гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах строгага рэжыму і вялізны штраф: прысуд праваабаронцу Леаніду Судаленку

Каталіцкі святар арыштаваны чацвёрты раз запар: хроніка пераследу 22-24 чэрвеня

У Мінску пачынаецца завочны суд над былым футбольным фанатам

Спектакль, квіз, "турэмны эксперымент": якія мерапрыемствы пройдуць у межах "Тыдня супраць катаванняў" 25-30 чэрвеня (дапоўнена)

Затрыманні, спецвытворчасць, ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 21 чэрвеня (дапоўнена)


У Мінску асудзілі Алену Церашкову, двухразовую чэмпіёнку Беларусі па тэквандо, пісьменніцу і хірургіню


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre Memorial

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections epde

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў baj.by

VOICE OF BELARUS

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY